**Віктар Іўчанкаў**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# МЕДЫІ Ў ПАЛОНЕ «ПАЛІТЫЧНАГА ПІСЬМА»: МАЎЛЕНЧАЕ АБЛІЧЧА ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЭПОХІ

Грамадства пераломy XX і XXI стагоддзяў як быццам кінута ў зацятае проціборства, у стан сеткацэнтрычнай вайны. Дактрына вядзення яе ўключае: а) дасягненне інфармацыйнай перавагі шляхам апераджальнага знішчэння цэнтраў інфармацыйнай апрацоўкі і вузлоў кіравання, б) заваяванне паветранай прасторы шляхам разбурэння сістэмы супрацьпаветранай абароны, в) паступовае знішчэнне пакінутых без кіравання ракетных комплексаў, авіяцыі, артылерыі, бронетэхнікі, г) канчатковае знішчэнне рэшткавага супраціву. Навязлівая вербальная агрэсія паступова транспануецца ў фізічную. Заўважым, адказнасць за дапушчэнне такой сітуацыі ляжыць на чалавечых супольнасцях.

Гісторыя станаўлення і развіцця рыторыкі да нашай эры (яе заняпаду і забыцця ў новы час) пацвярджае гэты факт. Слова, якое ўладарыла ў Афінах і было ўзведзена ў абсалют, пазней згубіла былую моц, перастала быць “магіяй” доказу, аргументацыі, пераканання. Рытар новага часу ўзяў на ўзбраенне сафістычную мадэль вербалістыкі, ператварыўся ў двухаблічнага Януса, гаваруна, які ўмее гаварыць пра ўсё, не ведаючы нічога… Маўленне становіцца кадыфікаваным, думкі блытанымі, словы двухзначнымі. Так, вайну да нядаўняга часу не прынята было называць сваім імем. Такая тэндэнцыя была характэрна для Расіі, Еўропы, ЗША. Яна (тэндэнцыя) лічылася дэмакратычнай і рэспектабельнай па прычыне сваёй імпліцытнасці. Было модным прыкрывацца індэксамі *“папярэджанне гуманітарнай катастрофы” (Югаславія, 2000 г.), “антытэрарыстычныя аперацыі”, “навядзенне канстытуцыйнага парадку” (Чачня, 2000-2002 гг.),* спачатку *“праграма прымірэння” (В’етнам, 1965),* а затым *“абаронная рэакцыя” (В’етнам, 1972)*, “*уварванне кааліцыйных сіл у Ірак” (2003 г.)*, “*узброены канфлікт на ўсходзе Украіны” (з 2014 г. па сёння).*

Сучасная вайна да падзей 11 верасня 2001 года і акупацыі Ірака не мела наймення адкрытага насілля і ваенных дзеянняў. Але яна была аб’яўлена чалавеку на ўзроўні дыскурсіўных стратэгій ужо даўно, калі непасрэдна ўключылася ў падсвядомае, інтуітыўнае, разумова-маўленчае. Уплыў такіх войнаў на псіхіку чалавека больш разбуральны, бо схаваны за рэальным ўспрыманнем. Яны (стратэгіі) вядуць да

незаўважнага панавання адных сацыяльных або этнічных груп над іншымі, не маючых доступу і кантролю над інфармацыйнымі плынямі і прыводзяць да войнаў адкрытых, тлумачэннем і прыкрыццём якіх з’яўляецца паступовая “кропельная” падрыхтоўка. Час сацыяльных узрушэнняў, якія балансуюць на мяжы ваенных канфліктаў, выяўна прадстаўлены “каляровымі рэвалюцыямі” (*гваздзікоў* (Партугалія, 1974), *жоўтай* (Філіпіны, 1986), *аксамітавай* (Чэхаславакія, 1989), *бульдозернай* (Югаславія, 2000), *руж* (Грузія, 2003), *аранжавай* (Украіна, 2004), *пурпурнай* (Ірак, 2005), *цюльпанавай* (Кіргізія, 2005), *кедраў* (Ліван, 2005), *валошкавай* (Беларусь, 2005), *шафранавай* (М’янма, 2007), *бэзавай* (Малдавія, 2009), *зялёнай* (Іран, 2009), *дыннай* (Кіргізія, 2010), *язмінавай* (Туніс, 2010–2011), *лотаса* (Егіпет, 2011), *балотнай* (Расія, 2011–2013), *годнасці* (Украіна, 2013–2014), *парасонавай* (Ганконг, 2014–2015), *хрызантэмавай* (Малдавія, 2015), *разетак* (Арменія, 2015) і інш.), “арабскай вясной” (Туніс, Алжыр, Іарданія, Емен, Егіпет, Маўрытанія, Марока, Заходняя Сахара, Ліван, Аман, Саудаўская Аравія, Судан, Джыбуці, Самалі, Сірыя, Бахрэйн, Кувейт, Буркіна-Фасо, Ірак, Лівія).

Імпліцытная вайна выяўляе сваё аблічча ў эксплiцытнай, становіцца неад’емнай рысай існавання чалавека, калі фарміруецца “ваенная” свядомасць пакалення. Тады настае час, у якім не трэба хавацца за словамі-прыкрыццямі. Ненаяўнае сацыяльна-маўленчае дзеянне ператвараецца ў наяўнае-ваеннае. Маштабнасць і частотная пранікальнасць камунікатыўных індэксаў у перцэптыўную свядомасць прыводзіць да саступлення з гуманістычных пазіцый, да антыгуманізму, адкрытай агрэсіі, дэманстрацыі сілы, дыктату і тэрору.

Перад намі так званае “палітычнае пісьмо”, задача якога “ў адзін прыём злучыць рэальнасць фактаў з ідэальнасцю мэтаў. Вось чаму ўсякая ўлада, або хаця б бачнасць улады, заўсёды выпрацоўвае аксіялагічны тэкст, дзе дыстанцыя, якая звычайна аддзяляе факт ад яго магчымасці – каштоўнасці, знішчаецца ў межах самога слова, якое аднaчасова становіцца і сродкам канстатацыі факта, і яго ацэнкай. Слова ператвараецца ў алібі (г. зн. ў сведчанне аб адсутнасці на месцы злачынства, у апраўдальны акт)” [1, 315].

Антычную рыторыку і сучаснасць нітуе міжнародны сацыяльна-гістарычны вопыт пераходу камунікацыі ад народнага (вальны сейм, грэчаская агора, рымскі каміцый, народны трыбун (*tribunus plebis*), старажытнарускае веча і інш.) да віртуальнага форуму (платформы сацыяльных сетак).

У антычнасці існавалі даступныя формы распаўсюджвання інфармацыі. Найбольш вядомыя з іх – старажытнагрэчаская агора і рымскі форум. Першапачаткова гэта былі гандлёвыя месцы, якія з часам ператварыліся ў цэнтры грамадскага (палітычнага, эканамічнага і рэлігійнага) жыцця. Напрыклад, рымскі форум пазней уключаў у сябе каміцый (месца народных сходаў), курыю (месца пасяджэнняў сената), чым набыў выразныя палітычныя функцыі. Сённяшняя панарама мінулых форумаў пакідае несуцішальнае ўражанне: на іх месцы бачым толькі рэшткі былой магутнасці – руіны. Што здарылася за дваццаць стагоддзяў новага часу?

Для верабалістыкі (у шырокім сэнсе камунікацыі) новы час мала прынёс новага, ён толькі запаволіў працэсы, якія нараджаліся ў старажытных Афінах – радзіме рыторыкі. Маем на ўвазе той факт, што з заняпадам рабаўласніцкай дэмакратыі пала і рыторыка.

Варта звярнуць увагу на адну акалічнасць: рыторыка дасягнула сваёй дасканаласці менавіта ў Афінах. Чаму гэта не спасцігла Спарту, ці Атыку, Этолію, Факіду, Антыёхію, Александрыю? Адказ на гэтае пытанне знаходзім у форме кіравання: ва ўмовах афінскай рабаўласніцкай дэмакратыі развіваецца грамадскае і палітычнае жыццё, і красамоўства становіцца неад’емнай часткай культуры, асноваўкладальным атрыбутам грамадскага кіравання. Невыпадкова феномен прамоўніцкага майстэрства адсутнічаў у дэспатыях, дзе дзяржаўны лад выключаў вольны абмен думкамі, доказы і спрэчкі, меркаванні і слоўныя баталіі.

Рыторыка – дзіця дэмакратыі. Толькі сёння можам гаварыць пра адраджэнне вербальнай практыкі чалавека. Звязана гэта перш за ўсё з уступленнем грамадства ў інфармацыйную эпоху, дзе выцесненае раней дэспатыяй і тыраніяй, манархіямі і імперыямі, каралеўствамі і царствамі стала адраджацца грамадскае кіраванне. З’яўляецца даволі спецыфічная форма э-дэмакратыі, якая падлягае краўдсорсінгавай тэорыі.

Сёння назіраем сітуацыю, характэрную для антычнасці, калі спраўджваецца пастулат сафістаў: *як у вольнай дзяржаве чалавек мае права меркаваць аб дзяржаўных справах і патрабаваць, каб з ім лічыліся, так і пра любы прадмет усякі чалавек мае права мець сваё меркаванне, і яно мае столькі ж правоў на існаванне, як і любое іншае.* Аб’ектыўнай ісціны няма – вучылі сафісты. Ёсць толькі суб’ектыўнае меркаванне пра яе: чалавек ёсць мера ўсіх рэчаў. Нельга сцвярджаць, што адна думка больш сапраўдная, чым другая. Можна гаварыць, што адна думка больш пераканаўчая, чым іншая. Навучыць пераконваць,

“слабае меркаванне рабіць моцным” – асноўная задача сафістаў-настаўнікаў. Спачатку сафісты вучылі вынайдзеным імі ж лагічным прыёмам доказу і абвяржэння, яны адкрылі шэраг правіл лагічнага мыслення, аднак у хуткім часе адышлі ад прынцыпаў яго арганізацыі і сканцэнтраваліся на распрацоўцы ўловак, хітрыкаў, заснаваных на знешнім падабенстве з’яў, на тым, што канкрэтная сітуцыя вынікае з агульных месцаў, падзея зыходзіць з агульнай сувязі падзей, на полісеміі, на падмене паняццяў і г. д.

Любы карыстальнік інтэрнэту сёння можа выказаць уласную думку, не зважаючы на яе суадноснасць з ісцінай – той, якую Сакрат называў абсалютнай. Менавіта ён першым нанёс сакрушальны ўдар па рытарычным ідэале сафістыкі. Сакрат катэгарычна выступіў супраць вучэння аб адноснасці ісціны. Абсалютная ісціна існуе, яна Божая, вышэйшая за чалавечыя меркаванні, і яна з’яўляецца мерай усіх рэчаў. Рытар сам павінен ведаць, што праўдзівае, а што падманлівае, што ёсць справядлівасць і несправядлівасць. Не валодаючы такімі ведамі, рытар-сафіст, які імкнецца да поспеху, будзе ісці за публікай, патакаючы ёй, прыносячы гэтым не карысць, а шкоду.

Пасля заваяванняў Аляксандра Македонскага фарміруецца новая плынь, якую сучаснікі назавуць “азіянствам”. Перайманне стыляў і прамоўніцкіх манер Лісія, Платона і Дэмасфена былі ўганараваны імем атыцызму, а традыцыі элііністычнай школы заклеймаваны кплівай мянушкай “азіянства”. Развіццё класікі падмянялася яе дагматызацыяй. Замест жывога слова асновай творчасці стала педантычная вучонасць, творы аднаўляліся паводле класікаў таго часу, інтэрпрэтаваліся паводле густаў тэарэтызуючых эстэтаў. Атыцызм стаў модай, даступнай толькі вузкаму колу знаўцаў такога мастацтва. Гэта нагадвае панарамную карціну ХХ стагоддзя, калі рыторыка становіцца элітнай дысцыплінай (выкладалася толькі ў абмежаваных установах тыпу ВПШ, ВКШ; з’яўляюцца празмерна тэарэтызаваныя, цяжкадаступныя неарыторыкі і інш.).

З заняпадам рабаўласніцкай дэмакратыі рыторыка ператвараецца ў нарматыўна-каталагізатарскую дысцыпліну і паступова раствараецца ў стылістыцы, якая і да апошняга часу ўтрымлівае ў сабе вялікі арсенал сродкаў, прыёмаў, фігур, тропаў, так бы мовіць, гатовых формул для пабудовы мастацка адзначанага маўлення, для ўпрыгожвання яго. Наменклатура тропаў у антычнасці складалася амаль з двухсот адзінак.

Перад тым як стаць набыткам сучаснікаў, формулы тропаў павінны быць вынайдзены. І часцей за ўсё гэта рабілася на антычных народных

форумах, калі трэба было запаліць сэрцы людзей, звярнуць іх розум да аб’екта дыскусіі, вобразнасцю ўзмацніць аргумент. Варта падкрэсліць: за дваццаць стагоддзяў не было вынайдзена ніводнага новага тропа, семантычнага пераносу, заснаванага на аналогіі, падабенстве, функцыі. Амаль усе існуючыя тропы маюць грэчаскую этымалогію (!). Каб вынайсці новы від тропа, трэба было б аднавіць і максімальна актывізаваць маўленчую практыку (што назіраем сёння ў “трэцяй” форме існавання мовы – віртуальнай!).

Вынайдзеная ў часы афінскай дэмакратыі і развітая антычнай рыторыкай мадэль камунікацыі docere – movere – delectare ў розныя эпохі перараблялася на свой манер. Часам з яе наўмысна выдаляліся складнікі, як гэта адбылося з апошнім у савецкія часы, ці дадаваліся новыя: напрыклад, ленінскае – “агітацыя і прапаганда”, кампаненты амерыканскай прапагандысцкай мадэлі – “тэорыі даміно” і інш.

У інфармацыйнае стагоддзе роля рыторыкі становіцца лёса-вызначальнай, бо яна ёсць анталагічная перадумова ўзнікнення журналістыкі, цесна спалучанай з вырашэннем трыадзінай задачы рыторыкі: docere – паведамляць, інфармаваць, адукоўваць, пераконваць; movere – узбуджаць, падштурхоўваць, рухацца, падахвочваць да дзеяння; delectare – забаўляць, задавальняць, прыносіць асалоду, выйграваць сімпатыі. Іншымі словамі, журналістыцы наканавана сканцантравацца на трох фактарах – і**нфармуючы, даказвацьісціннасць таго, пра што паведамляецца, чым падахвоціць аўдыторыю да пэўнага дзеяння, і, уплываючы на яе эмацыянальны стан, заваяваць сімпатыі, схіліць на свой бок**.

Медыі становяцца вызначальным арыенцірам у маўленчых паводзінах. Яны ж сёння фарміруюцца больш за ўсё праз тэксты масавай камунікацыі. І адбываецца гэта намнога хутчэй, чым мы падрыхтаваны да такіх змен… Асабліва гэта разумееш, калі бярэш пад увагу той факт, што развіццё мовы ў XXI ст. ідзе не павольнымі крокамі мінулых эпох, а з’яўляецца цэнтрабежнай імклівай сілай, якая кардынальна мяняе маўленчае аблічча інфармацыйнай эпохі. Меркурый павінен вярнуць людзям Рыторыку…

***Літаратура***


1. Барт, Р. Нулевая степень письма / Р. Барт // Семиотика. – М.:Радуга, 1983. – 636 с.